Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі

Інструктар-лётчык Менскага аэраклуба Клава Ладзо

№ 15

Жнівень 1936 г.

Выданне ЦК КП(б)Б

БЕСПАСАДАЧНЫ ДАЛЬНІ ПЕРАЛЁТ

Бяспрыкладны ў гісторыі авіяцыі пералёт зрабілі бясстрашныя пілоты тт. Чкалаў, Байдукоў і Белякоў.

Маршрут, даны самім вялікім Сталіным, натхняў герояў-лётчыкаў на безумоўны поспех пералёта. Совецкі аэраплан, зроблены з уласнай сыравіны на совецкіх заводах, совецкімі рабочымі, забяспечыў выкананне гэтага пачэснага задання.

Уся краіна сачыла за пералётам, мільёны сэрцаў часцей біліся ў трывозе за лёс трох бясстрашных сокалаў нашай вялікай радзімы.

І нарэшце радыё, газеты разнеслі па ўсяму нашаму неабсяжнаму Саюзу надзвычайную радасную вестку: пералёт закончан бліскуча, пілоты вітаюць таварыша Сталіна, вялікага натхніцеля нябачаных у свеце перамог совецкага народа.

56 гадзін 20 мінут прабылі адважныя пілоты ў паветры, і ні разу не здрыгануласа рука ў кіраўніцеля машыны, і ні разу цень сумнення не амрачыў бадзёры і роўны настрой іх.

Адвага і гераізм у нашай гераічнай краіне ўзнагароджваюцца па заслугах і таму тт. Чкалаву, Байдукову і Белякову надана званне Герояў Совецкага Саюза і ўручаны ордэны Леніна за ажыццяўленне гераічнага беспасадачнага дальняга пералёта па сталінскаму маршруту: Масква—Паўночны Ледавіты акіян—Камчатка—Нікалаеўск-на-Амуры.

Удзельнік пералёту лётчык-выпрабавальнік завода імя Гарбунова тав. БАЙДУКОЎ.



Удзельнік пералёту лётчык-выпрабавальнік ордэнаносец тав. ЧКАЛАЎ.

Удзельнік пералёту штурман кіраўніцтва ваенна-паветраных сіл РСЧА тав. БЕЛЯКОЎ.

Александр Ойслендэр

Адважным

На зары,
Калі дымяцца травы
І вакол
Сінее цішыня,—

Вы ўзнялі
Ў блакітнае раздолле
Свой шырокакрылы
Самалёт.

Прывітанне, край,
Дзе я не быў ніколі,
Дзе наш подых
Супыняе лёд,

Дзе сівыя хмары
Праплываюць,
Дзе насустрач—
Рэдкае жыллё,—

Але з вамі—
Юная, жывая
Наша бацькаўшчына,—
Ўся сама—палёт!

Хай лавіна
Падае ў аддалі,
Снежны пыл
Узмёўшы на зямлі,—

Ні вады, ні сушы
Не краналі
І маршрут свой
З гонарам прайшлі!

Мы лавілі
Радыёсігналы,
Што ішлі
Скрозь воблакі і лёд.

Сем рэспублік
Верылі і зналі:
Перамогай
Скончыцца палёт.

Гэта ты,
Краіна маладая,
Выхавала
Сокалаў такіх,

Што заўжды і ўсё
Перамагаюць,
У паветры
І ў шляхах марскіх!

Пераклаў **Юр. Лявонны.**

Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

НІКАЛАЕЎСК-НА-АМУРЫ

ЭКІПАЖУ САМАЛЕТА „АНТ-25“

ЧКАЛАВУ, БАЙДУКОВУ, БЕЛЯКОВУ

Прыміце брацкае прывітанне і гарачыя віншаванні з паспяховым завяршэннем выдатнага палёту.

Ганарымся вашай мужнасцю, адвагай, вытрыманасцю, хладнакроўем, настойлівасцю, майстэрствам.

Увайшлі ў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Советаў Саюза з хадайніцтвам аб прысваенні вам звання герояў Совецкага Саюза і выдачы грашовай прэміі камандзіру самалёта Чкалаву ў размеры 30 тыс. руб., лётчыку Байдукову і штурману Белякову па 20 тыс. руб.

Моцна паціскаем вам рукі!

Сталін, Молатаў, Орджанікідзе, Варашылаў, Жданаў.

СТАЛІНСКІ МАРШРУТ

У першых лічбах чэрвеня мы атрымалі шчаслівую магчымасць гутарыць з таварышам Сталіным, лепшым другам совецкіх лётчыкаў, выкласці яму наш план палёта і атрымаць ад яго падрабязныя і дакладныя ўказанні, куды нам ляцець. Гэта кароткая гутарка назаўсёды запала нам у душу, яна надала нам энергіі, бадзёрасці і смеласці ў выкананні адказнай лётнай задачы, якую паставіў перад намі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін.

Гэта было на адным з пасяджэнняў Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). У часе перапынку мы падыйшлі да Серго Орджанікідзе і запыталіся ў яго пра лёс нашага праекта дальнага пералёту.

— Не сядзіцца вам,—засмяяўся Серго,—усё ляцець хочаце. Машыну трэба добра праверыць.

Мы жыва адказалі, што машына, на якой збіраемся ляцець,— праверaная, хоць сёння ляці...

— Ладна,—сказаў Серго, бачачы нашу нецярплівасць.—Я вас з таварышом Сталіным звяду. Што ён скажа...

Расчыняюцца дзверы. Уваходзіць таварыш Сталін. Ён падышоў да нас, павітаўся, моцна паціснуў рукі. І, усміхаючыся, запытвае:

— У чым справа? Чаго вы хочаце, тав. Чкалаў?

Таварыш Сталін, як відаць, па нашых узбуджаных тварах зразумеў, што мы чымсьці ўсхваляваны. Сапраўды, надыйшла рашаючая мінута размовы з таварышом Сталіным. Ухваліць ён наш праект, ці адкіне?

— Просім вашага дазволу, Іосіф Вісарыёнавіч, зрабіць пералёт да Паўночнага полюса.

Тав. Орджанікідзе звяртаецца да падышоўшых таварышоў Молатава, Варашылава, Кагановіча і паказвае на нас:

— Вось хочуць ляцець на Паўночны полюс!

Мы стаім здэтанаваныя і, хвалюючыся, чакаем сталінскага адказу.

Таварыш Сталін жартаўліва кідае:

— Навошта лятаць абавязкова на Паўночны полюс? Лётчыкам усё здаецца нястрашным—прызвычаіліся да рызыкі. Навошта рызыкаваць без патрэбы?..

— Ды машына-ж добрая, матор добры. І рызыкі мала, таварыш Сталін.

Сталін працягвае ледзь-ледзь жартаваць з нас, потым ужо сур'ёзным тонам тлумачыць нам, што ўмовы палёта ля Паўночнага полюса мала вывучаны. Трэба добра і падрабязна ўсё вывучыць, каб напэўна ўжо ляцець... Наш Саюз неабсяжны. Лятайце праз нашу тэрыторыю.

І, памаўчаўшы, уважліва глянуўшы на нас, нечакана дадае:

— Вось вам маршрут для палёта: Масква—Петрапаўлаўск-на-Камчатцы.

Гэта было настолькі нечакана, што мы не адразу маглі адказаць. У думках кожны з нас ахоплівае прапанаваны Сталіным маршрут палёта. Якія велізарныя прасторы, колькі белых плям на шляху, колькі навіны ў гэтым шляху. Таварыш Сталін высунуў перад намі новую лётную задачу, звязаную з нашай радзімай. Ён ведаў, што прапанаваць совецкім лётчыкам. І мы з радасцю, горача прынялі сталінскі праект пералёта.

І на другі дзень мы прыступілі да энергічнай падрыхтоўкі к палёту. Да апошніх дзён мы адчувалі на сабе сталінскія клопаты. За некалькі дзён да адлёту ўвесь экіпаж самалёта—Чкалаў, Байдукоў, Белякоў былі выкліканы ў Крэмль. Увайшоўшы ў габінет, мы ўбачылі таварышоў Сталіна, Молатава, Орджанікідзе, Ежова, Межлаука, М. М. Кагановіча. Таварыш Сталін прывітаўся з намі і сказаў:

— Дакладвайце, тав. Чкалаў.

Чкалаў папрасіў дазволу павесіць карту пералёта. Таварыш Сталін дазволіў. Чкалаў павесіў карту і стаў падрабязна растлумачваць маршрут пералёта.

— Чаму вы абралі такі паўночны варыянт?—запытаўся таварыш Сталін.

Чкалаў адказаў, што гэты варыянт найбольш цікавы, бо совецкія лётчыкі павінны прабірацца ўсё далей на Поўнач. Развітваючыся з намі, таварыш Сталін жартаўліва запытаўся, паказваючы на сэрца:

— Ну, кажыце шчыра, як у вас там, усё ў парадку, ці няма там у вас чарвяка сумнення?

— Не, таварыш Сталін, мы спакойны, мы гатовы да старта.

Таварыш Сталін цёпла і пасяброўску сказаў:

— Ну добра, няхай будзе па-вашаму.

Мы вышлі з Крэмля радасныя, усхваляваныя словам таварыша Сталіна, сказаным перад нашым стартам. Усё, што мы рабілі на зямлі і ў паветры ў часе трэніровачных палётаў,— усё было звязана з імем Сталіна. Бо ідэя-ж пералёту належыць правадыру народаў таварышу Сталіну, які натхніў нас на далейшы пералёт ва славу і на карысць нашай радзімы.

Лётчыкі **Валерый ЧКАЛАЎ**
Георгій БАЙДУКОЎ

(Перадрукавана з „Правды“)

Лятаць далей за ўсіх, вышэй за ўсіх і хутчэй за ўсіх

Незабыўныя старонкі гераізма ўпісалі ў гісторыю авіяцыі совецкія лётчыкі. Яшчэ зусім свежы ў памяці подвігі надзвычайных совецкіх пілотаў, чыя мужнасць і геройства перамаглі ўсякія перашкоды і выратавалі нашых слаўных чэлюскінцаў. Толькі нядаўна іх было семера, герояў Совецкага Саюза, потым іх стала восем. Цяпер да гэтай слаўнай сям'і герояў нашай вялікай краіны дадалося яшчэ трое, трое адважных, бясстрашных герояў—т.т. **Чкалаў, Байдукоў і Белякоў**, бліскуча завяршыўшых сталінскі маршрут дальняга пералёту.

Ні адна з капіталістычных краін у свеце, нават тыя, што лічаць сябе перадавымі па ўзроўню спартыўных навыкаў і настойлівай авіяцыйнай прапагандзе, не мае такіх подвігаў у лётнай справе, не мае столькі адважных парашутыстаў, як Совецкі Саюз. Дзесяткі тысяч смелых, скромных, адданых совецкіх дзяўчат і юнакоў асвоілі тэхніку прыжка з парашутам. А за граніцай чалавек рашаецца скокнуць з парашутам толькі ў выпадку паломкі самалёта, або за вялікія грошы.

Бязмежная любоў да радзімы натхняе совецкі народ на геройства, на вялікія справы. Велізарная любоў да сваёй бацькаўшчыны і імкненне ўмацаваць яе магутнасць, беззаветная адданасць нашай комуністычнай партыі і любімаму правадыру таварышу Сталіну,—вось што ўзнімае і акрыляе людзей, надае ім сілы, кліча на подвігі і геройства.

Герой Совецкага Саюза таварыш Чкалаў у сваім пісьме з Нікалаеўска-на-Амуры пісаў:

„Імя Сталіна, яго клопаты аб людзях, яго любоў да людзей была рухаючай сілай у гэтым пералёце. Сталін быў пачэсным штурманам нашага карабля. Яго імя давала нам адпачынак і энергію для ўтварэння пералётаў".

У нас кожны чалавек—на якой-бы пасадзе ён не знаходзіўся, якую-б работу не выконваў—адчувае штодзённыя бацькаўскія клопаты любімага Сталіна, ведае, што жыццё чалавека высока ацэньваецца нашым грамадствам, што ў нас кожнаму дадзены ўсе магчымасці праявіць свае здольнасці і нахілы і стаць героем вялікай совецкай краіны.

Наш совецкі народ любіць авіяцыю і глыбока вывучае яе. У развіцці авіяцыі мы бачым адзін з магутных сродкаў абароны нашай радзімы.

Тав. Косарэў у справаздачным дакладзе на X Усесаюзным з'ездзе ленінскага комсамола ўказаў, што „той, хто моцны ў паветры, непераможны ў надыходзячай вайне, і нам трэба прынамсі ў бліжэйшы год—два падрыхтаваць у пяць разоў больш лётчыкаў без адрыва ад вытворчасці".

На гэты заклік адгукнуліся сотні, тысячы юнакоў і дзяўчат.

Комсамолец на самалёт! Гэты лозунг з'яўляецца адным з самых папулярных у нашай краіне.

У аэроклубах ордэнаноснай Совецкай Беларусі сотні лепшых сыноў і дачок беларускага народа навучаюцца складанаму майстэрству пілатавання. Шмат якія з іх, аўладаўшы вучэбнымі самалётамі, перасаджваюцца на рабочыя машыны, з тым, каб з цягам часу стаць сапраўднымі майстрамі лётнай справы.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя прадаставіла совецкай жанчыне сапраўднае роўнапраўе з мужчынай. Сталінская Канстытуцыя асабліва сцвярджае дастоінства совецкай жанчыны як работніцы і грамадзянкі.

Няма такой галіны народнай гаспадаркі, дзе-б жанчыны не паказвалі надзвычайных узораў работы. Да рэволюцыі ніхто і не меркаваў аб удзеле жанчыны ў авіяцыйнай справе, а зараз яна не горш за мужчыну робіць самыя складаныя аперацыі на самалёце. Толькі нядаўна ўрад узнагародзіў вышэйшай узнагародаю—ордэнамі Саюза—лётчыц РСЧА тт. Казарынову, Несцярэнко, Уразаву.

Калі скромныя, вытрыманыя дзяўчаты—работніцы, комсамолкі тт. Лабзо, Слесарава, Рабава і іншыя паступалі ў аэроклуб, многія скептычна махалі рукамі:

—Куды ім! Ніколі ім не стаць пілотамі!

А сёння? Сёння гэтыя дзяўчаты не толькі доб-

рыя пілоты. Клава Лабзо і Вера Булатава—сёння інструктары менскага аэраклуба і самі рыхтуюць будучых пілотаў, а Дора Слесарава і Маруся Рабава ў Маскве на курсах. Яны хутка стануць інструктарамі парашутызма першай катэгорыі.

Лік дзяўчат, якія імкнуцца стаць лётчыкамі, узрастае з кожным месяцам, так-жа, як узрастае іх любоў і адданасць вялікай совецкай радзіме.

18-е жніўня—Дзень авіяцыі. Гордыя сокалы краіны Советаў у гэты дзень прадэманструюць перад усім совецкім народам дасягненні нашага паветранага флоту. Тысячы адважных парашутыстаў і парашутыстак упрыгожаць неба рознаколернымі купаламі парашутаў.

Святкуючы дзень авіяцыі, мы павінны паставіць перад сабой задачу яшчэ большага ўмацавання асоавіяхімаўскай і аэраклубнай работы і ўзмацнення барацьбы за тое, каб мільёны працоўных аўладалі авіяцыйным спортам.

У Совецкай краіне створана магутная прамысловасць, здольная вытвараць сотні і тысячы цудоўных сталёвых птушак. Хай памятаюць імперыялістычныя фашысцкія драпежнікі, рыхтуючыя напад на Совецкі Саюз, што для совецкіх самалётаў, кіруемых адданымі сынамі радзімы, няма перашкод і адлегласцей. Гэта яшчэ раз даказаў бліскучы пералёт герояў Совецкага Саюза **т. Чкалава, Байдукова і Белякова.**

Фізкультурны парад у Маскве 6 ліпеня 1936 г. (Саюзфота

Наперад і вышэй

У гэты дзень ярка свяціла сонца, далячынь сінела за аэрадромам, укатаны, спластаваны снег здаваўся мармуровым. Ішоў снежань 1933 году з яго маразамі і суверямі, з крыштальным паветрам. Гэта быў надзвычайны месяц бадзёрасці і радаснага хвалявання для Веры Булатавай.

— Першы палёт!

На аэрадроме канчаліся апошнія падрыхтаванні „ў дарогу".

Інструктар авіяшколы „Дынамо" тав. Алексееў уважліва, па гаспадарску агледзеў матор, павольна павёў рукою па фюзеляжу лёгкага, як дзівосная птушка, самалёта „У-2" і яшчэ раз напомніў ёй:

— Толькі, Вера, без усякага зазнайства і рызыкі! Больш патрабаванняў да сябе. І ўсё будзе добра!

І вось ужо зусім непрыкметна, неадчувальна аддзяляецца акрытая снегам зямля.

„Наперад і вышэй!"

Бліскучая белая роўнядзь рассцілаецца пад апаратам. Гудзіць і спявае выверапы матор і хвалі свежага, да болю рэзкага ветра́ ірвуцца насустрэч.

„Наперад і вышэй!"

Цяпер, калі лётчык-інструктар менскага аэраклуба Вера Булатава ўспамінае свой першы палёт, ён здаецца такім звычайным і простым.

— А ведаеце, тады, упершыню за рулём, усё-такі страшнавата было! Страшнавата—і разам з тым прыемна. Нейкая шалёная радасць! Вы не можаце сабе ўявіць, што гэта за адчуванне: і ўздым, і гонар, і сіла! У гэты дзень я зрабіла тры палёты—усе з надзвычай удалай, правільнай пасадкай.

З таго памятнага дня мінула каля трох год.

За гэты час дачка адэскага рабочага—наборшчыка, дваццацічатырохгадовая Вера Булатава з „аматара"-вучлёта стала інструктарам лётнай справы.

За гэты час яна зрабіла каля 800 палётаў, з агульным „налётам" звыш 200 гадзін...

— Неперадаваемае адчуванне было ў мяне яшчэ адзін раз,—калі ўпершыню ўзнімала ў паветра пасажыра — работніка „Дынамо", — расказвае Вера.—Тут асаблівае пачуццё адказнасці не толькі за сваё жыццё, але і за жыццё другога чалавека, які даверыўся табе, тваёй тэхніцы і ўменню!

Цяпер за плячыма Веры Булатавай—авіяшкола „Дынамо" і школа інструктароў-лётчыкаў.

Цяпер яна сама ўважліва і настойліва выхоўвае новыя атрады вучлётаў, новыя кадры людзей, авалодваючых паветранай стыхіяй, адважных сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы.

У яе групе зараз займаецца 8 чалавек—пераважна дзяўчаты.

Гэтыя маладыя дзяўчаты з групы Веры Булатавай—Леановіч Ахрамовіч і іншыя,—ужо даволі добра лятаюць, дасканала вывучылі машыну, маюць па некалькі прыжкоў з парашутам.

Вера БУЛАТАВА. (Фота Каплінскага).

... Не лёгка дастаюцца дзве зорачкі на блакітных пятліцах—знакі адрознення лётчыка-інструктара аэраклуба.

Тут і веданне тэхнікі, і асабістая трэніроўка, і папярэдняя здача ўсіх норм.

Тут смеласць, рашучасць, напорыстасць, упэўненасць у сваіх сілах,—тут усе якасці, так характэрныя для моладзі краіны Советаў.

Інструктар Булатава заслужана карыстаецца павагай і аўтарытэтам сярод сваёй групы вучлётаў і ў камандна-палітычнага склада менскага аэраклуба.

Бо ў ёй удала спалучаюцца памянёныя рысы, бо яна ведае, што рыхтуе не аматараў моцных адчуванняў—рызыкуноў, а свядомых, бясстрашных лётчыкаў, гордых сокалаў соцыялістычнай радзімы, гатовых па першаму закліку партыі і ўраду ва ўсеўзбраенні вылецець на абарону яе свяшчэнных рубяжоў.

„Наперад і вышэй!". **Юр. Лявонны.**

Шчаслівая праца

Ліза Грынберг моўчкі застанавілася каля дзвярэй. Перад яе вачыма прадсталі горы рознакаляровых каробак, якія рабілі жанчыны, сядзячыя за доўгімі сталамі. Спрытна мільгалі ў іх руках паняровыя стужкі і ўжо гатовыя каробачкі.

— О, як цікава працаваць!— падумала Ліза, чакаючы начальніка цэха тав. Марголіна, які неўзабаве падышоў да яе.

— Ці не на работу да нас?—ветліва запытаў ён.

— Так, мяне паслаў дырэктар!—саромліва адказала яна.

А на другі дзень дзяўчына ўжо старанна клеіла каробкі, прыглядаючыся да старых работніц. Што незразумела было, цыталася ў суседак -або ў тав. Марголіна.

За кароткі час Ліза паспела добра асвоіць сваю работу. Яна ўжо не пыталася, як рабіць тую ці іншую каробку, а наадварот, сама растлумачвала новенькім работніцам. Старыя работніцы адразу заўважылі здольнасць маладой дзяўчыны, якая даганяла ўжо самых перадавых.

З разгортваннем стаханаўскага руху стала відавочна, што наша тэхнічная база і нашы кадры пры соцыялістычных метадах работы значна перараслі старыя нормы выпрацоўкі. І таму на фабрыцы „Чырвоны Харчавік", як і на тысячах прадпрыемстваў у нашай краіне, былі ўведзены новыя тэхнічныя нормы. З запалам узялася Ліза за іх усваенне. Задоўга да пачатку работы яна падрыхтоўвала матэрыял і рабочае месца, каб не адрывацца ў рабочы час і скараціць непатрэбныя рухі. І Ліза дабілася свайго: план яна выконвае на 190—200 процантаў.

Ліза Грынберг лепшая стаханаўка не толькі па цэху, але і па ўсёй фабрыцы.

Яна актывістка і ў грамадскім жыцці. Як член камітэта комсамола, яна мае нагрузку па абаронай рабоце, якую добра выконвае. Займаецца сама і ўцягнула ўсіх дзяўчат у стралковы гурток і „ГСО". На другой раённай канферэнцыі Асоавіяхіма яе абралі дэлегатам на Усебеларускі з'езд АСО.

Зараз усе працоўныя вялікага Совецкага Саюза абгаварваюць праект сталінскай Канстытуцыі. Ліза Грынберг праводзіла чытку Канстытуцыі ў сваёй брыгадзе.

— Кожны артыкул, кожнае сталінскае слова выражаюць вялікія клопаты аб людзях, аб прыгожай сучаснасці і будучыне совецкай моладзі, якая так удзячна вялікаму Сталіну за шчаслівае светлае юнацтва,—кажа Ліза.

Баравікова.

Бабруйск.

Балетны гурток рабочых абутковай фабрыкі імя Кагановіча. (Белсаюзфота).

Казка стала явью

Сёння іх трыццаць адважных і гордых, смелых і адданых дачок краіны. Трыццаць дзяўчат Совецкай Беларусі кожны дзень адрываюцца ад зямлі і вучацца, напружана і сур'ёзна, каб увайсці ў сям'ю гордых сокалаў нашай краіны.

Яны ірвуцца ўвысь, яны авалодваюць паветрам, хаця і на зямлі, на совецкай зямлі ім прадастаўлена надзвычайнае, пачэснае месца.

Прыклад герояў Совецкага Саюза, імёны тт. Чкалава, Байдукова і Белякова, павялічыўшых лік герояў нашага гераічнага народа, натхняюць іх на барацьбу за аўладанне паветрам, якім так лёгка дыхаць у нашай цудоўнай краіне.

І яны вучацца лётнай справе без адрыва ад вытворчасці. На аэрадром пасля работы сыяшаюцца лепшыя стаханаўкі нашых фабрык. І слаўная дзяўчына з беларускага тэхнікума, які ў цудоўнае свята сілы і хараства 6 ліпеня прадэманстраваў—разам з маскоўскімі і украінскімі фізкультурнікамі—на Краснай плошчы перад трыбунай, дзе стаяў сам **Сталін.** І жыццярадасная работніца

Учлёты т. Аладзьева (зверху) і т. Гладкова (знізу).

Парашутыстка Люся Чарнамор.

НКУС, выхаваная ў сям'і большэвіка-чэкіста. І чыгуначныя тэхнікі, будаўнікі нашых надзвычайных дарог.

І гэтыя дзяўчаты, якія падзяляюць свой ласны дзень на розную работу ў рознастайных галінах і на вучобу ў лётнай школе, вельмі падобны адна на другую. Ва ўсіх натхненныя твары, гарачыя вочы, ва ўсіх стройныя, фізкультурныя целы, ва ўсіх жар у грудзі і хуткасць у рухах і суровая прадуманасць, калі яны садзяцца ў самалёт.

Усе яны члены ленінскага комсамола, і гэта робіць іх яшчэ больш адважнымі, і гэта абавязвае іх да яшчэ больш дакладнай работы і вучобы.

У мінулым годзе ў менскім аэраклубе ведалі толькі адну дзяўчыну, якая навучалася лятаць. Гэта Клава Лабзо.

Яна здавалася ўсім дзіўнай. Клава Лабзо надзвычай добра працавала на вытворчасці і экзамены ў лётнай школе здала на „выдатна".

— У гэтай дзяўчыны дзівосныя здольнасці, надзвычайныя, палаючыя мазгі,—гаворыць пра Клаву начальнік лётнай часці аэраклуба тав. Скорб.

Сёння Клава разам з Верай Булатавай інструктар лётчык, сёння Клава вучыць лятаць другіх.

„Мы рождены, чтоб сказку сделать былью",— пяюць совецкія лётчыкі.

— Для нас, совецкіх дзяўчат, дачок вялікай сталінскай эпохі, якія жывуць у перыяд стварэння новай, нябачанай у свеце Канстытуцыі, для нас казка стала былью,— гаворыць Клава.

І ўся яе стройненькая фігурка дыхае перамогай, волю і ўпартае імкненне наперад выяўляе рот, сталасць, напружаная ўвага ў яскравым бляску яе шэрых воч.

— Мы шчаслівыя дочкі шчаслівай краіны, мы павінны шмат ведаць, мы павінны шмат чаму вучыцца, але сваёй спецыяльнасцю мы абавязаны аўладаць дасканала.

Гэта была асноўная думка, якую правяла Клава ў сваім выступленні на сустрэчы жанчын—лётчыкаў, планерыстаў і парашутыстаў з работнікамі журнала „Работніца і Калгасніца Беларусі". І відаць было, як усе прысутныя ў сэрцы сваім адказалі сваёй старэйшай у лётнай справе сяброўцы:

— Ёсць—сваёй спецыяльнасцю аўладаць дасканала!

Суровая дысцыпліна і ніякага адцення ліхацтва—вось першае асноўнае правіла лётчыкаў. У авіяцыі няма дробязей—вось другая догма пілота. І кожная дзяўчына—лётчык, планерыст, парашу

Учлёты Аня Чыкунова (зверху)

і Маруся Цырлікевіч (знізу)

КАЗКА СТАЛА БЫЛЬЮ (Працяг)

тыст—аб гэтых лётных законах гаворыць з уздымам, з прагнасцю аўладаць лётнай справай.

Паступленне дзяўчыны ў лётную школу на жаль да гэтага часу ў некаторых сям'ях сустракаюць у штыкі.

— Кінуць медінстытут і пайсці ў нейкую лётную школу—вар'яцтва,—казалі бацькі Веры Самасюк, абураючыся дачкой—вучаніцай планернай школы.

Аня Чыкунова доўга хавала ад мацеры сваю вучобу ў планерным гуртку, але хтосьці з таварышоў прагаварыўся, і панесліся з Гомеля ў Менск пісьмы ад абуранай маткі да непакорнай дачкі.

Нічога не дапамагала, і цяпер Аня выдатніца лётнай школы.

Займацца лётнай справай дзяўчатам перашкаджаюць іншы раз і на рабоце. Тасі Балашовай асабліва не шанцуе ў гэтых адносінах. Калі яна працавала на раёне, з яе ўсе кпілі:

— Купім табе парашут і скачы з 8 паверху!

Ды і цяпер дзяўчыне даюцца нялёгка наведванні клуба і вучоба ў групе маторнага лятання.

— Я цябе зволю,—пагражае ёй штодня т. Тарасевіч—дырэктар друкарні, дзе яна працуе.

Перад аэраклубам тут наперадзе яшчэ шмат работы. Неабходна стварыць вакол дзяўчат—лётчыц такую атмасферу, каб кіраўнікі прадпрыемстваў, на якіх яны працуюць, не толькі не перашкаджалі, а дапамагалі-б ім вучыцца.

Затое ўзорам цяплыні і дружбы з'яўляецца маладая сям'я Ніны Аладзьевай. Муж яе — шофер—спачувае ёй у любові да лётнай справы. І Ніна прызнаецца, што іншы раз, калі яна спяшаецца з аэрадрома на фабрыку, ён адвозіць яе на машыне, абы яна не спазнілася на работу.

Прыходзячы ў аэраклуб, імкнучыся ў лётную школу, дзяўчаты баяцца медычнага агляда. Толькі самых здаровых дапускаюць да лётнай справы. І тут шмат непрыемнасцей прыносіць дзяўчатам малы рост.

Галя Огінт дагэтуль лятае з падушкай, а Надзю Гладкову і зусім не хацелі прымаць у школу. Гору дзяўчыны не было граніц.

Яна сапраўды вельмі малая ростам, гэтая адважная дзяўчына. Але яна—тэхнік па чыгуначнаму будаўніцтву—так імкнулася патрапіць у Менск, каб мець магчымасць вучыцца лятаць. Яна працавала на будаўніцтве дарог у глухіх раёнах. Зараз яна нарэшце ў Менску, яна член асоавіяхіма. Яна член аэраклуба. Няўжо-ж малы рост—вечная яе непрыемнасць—перашкодзіць ёй ажыццявіць сваю мару. У нас-жа няма бясплодных лятуценняў, у нашай краіне ўсе-ж мары так лёгка робяцца рэальнасцю.

І доктар злітаваўся над ёю:

— Прыходзьце раніцой, раніцой мы ўсе крышку вышэй, мажліва і падыйдзеце.

А на заўтра—ура! Надзя аказалася вышэй на цэлых два сантыметры. І Надзя лятае, высока лятае! Так падзяляе яна дзень свой на будаўніцтва дарогі і аэрадром, на зямлю і неба, як гаворыць яна.

І цяпер яна ведае радасць палёта. Ды і не толькі яна.

— Радасць палёта! Гэта трэба паспытаць! З гэтым-жа нішто не можа параўнацца. Няма большай радасці ў свеце, як валодаць самалётам, няма большага хараства, як у паветры,—натхнена гаворыць Люся Чарнамор.

І так хочацца сказаць усім гэтым цудоўным дзяўчатам:

— Лятайце, дзяўчаты, прыгайце, дзяўчаты, радуйцеся, дзяўчаты! Вы ўладаеце самай шчаслівай у свеце зямлёй і самым свежым у свеце паветрам.

С. Чорная.

(Фота Каплінскага)

Новы набор менскага аэраклуба:

Злева направа: Зіна Нісялеўская, Тася Балашова, Валя Мазанік і Вера Самасюк

Учлёты Люся Гладышэўская (злева) і Зоя Леанові̆ч (справа), учлёт парашутыстка Галя Огінт (пасярэдзіне).



Т. т. Сталін, Молатаў, Чубар, Орджанікідзе, Межлаук, Бауман і Дэборын ля Крэмлёўскай сцяны на пахаванні прэзідэнта Акадэміі навук СССР А. П. Карпінскага. (Саюзфота).



У ноч на 15 ліпеня на дачы пад Масквой памёр на 90 годзе жыцця адзін з буйнейшых сусветных вучоных, прэзідэнт Акадэміі Навук СССР акадэмік **Александр Пятровіч Карпінскі.**

Акадэмік А. П. Карпінскі заслужана лічыцца бацькам совецкай геалогіі (навукі аб будове зямлі). Яго пяру належыць каля 300 каштоўнейшых геалагічных работ. Нават у апошнія гады свайго жыцця Александр Пятровіч, не гледзячы на свой узрост, не пераставаў займацца вялікай навуковай работай, кіраваў дзейнасцю Акадэміі Навук СССР, жыва цікавіўся жыццём сваёй соцыялістычнай радзімы.

А. П. Карпінскі быў выдатным грамадскім дзеячом, карыстаўся велізарнай вядомасцю і папулярнасцю ў мільёнаў працоўных. На VII Усесаюзным з'ездзе советаў ён быў выбран членам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР.

Радзіўшыся ў змрочныя гады нікалаеўскай эпохі, бачыўшы, як пакутвалі народы пад прыгнётам самаўладства акадэмік Карпінскі дажыў да перамогі соцыялізма ў нашай краіне і горача вітаў праект новай сталінскай Канстытуцыі СССР.

У спачуванні дачкам нябожчыка таварышы **Сталін і Молатаў** пісалі:

„Смерць Александра Пятровіча Карпінскага, буйнейшага сусветнага вучонага, бяззменнага прэзідэнта Акадэміі Навук з 1916 г. і выдатнага грамадскага дзеяча,— з'яўляецца цяжкай утратай для ўсёй совецкай навукі і працоўных Саюза ССР".

Совет Народных Камісараў Саюза ССР, прызнаючы буйнейшыя заслугі нябожчыка перад совецкай краінай, вынес спецыяльную пастанову аб увекавечанні памяці А. П. Карпінскага.

ПРАВА на адпачынак

Дзесьці пад хваінкамі, схаваўшыся ад залатых праменняў сонейка, стракаталі конікі і чыркуны. Пад прыгоркам блакітнай стужкай, як змейка, абвіла рака зялёную коўдру прыгожай палянкі, на якой выразна вылучаліся бронзавыя целы адпачываючых.

Маладзейшыя боўталіся ў вадзе і плавалі, а старэйшыя на беразе загаралі. Штомінуту плылі перапоўненыя людзьмі лодкі.

Здалёку чутна была песня аб радзіме, якую запяваў звонкі дзявочы голас...

„Широка страна моя родная..."

...дружна падхапілі некалькі галасоў. Гэта моладзь з фізкультурнага тэхнікума практыкавалася грэбсці і добра плаваць.

Зусім нечакана пачуўся званок на абед...

— Гэй, дзяўчаты, пайшлі!— паклікала з берага маладая дзяўчына.

Зялёны, на палову шкляны будынак, акружаны клумбамі кветак, паступова паглынаў людскі натоўп. Каля дзвярэй вісеў вялікі плакат „Добро пожаловать". Гэтыя літары відны здалёк.

— Сядайце, калі ласка!—ветліва запрашала гаспадыня-загадчыца сталовай тав. Нахамава.

— Гаспадыня!—паклікаў нечый голас.

Софія Ізраілеўна падыйшла да чарнявай жанчыны.

— Што такое?—мякка запыталася яна.

— Я хачу дабавачнае—катлеты,—адказала работніца друкарні імя Сталіна тав. Грынгауз.

Софія Ізраілеўна дала распараджэнне афіцыянтцы прынесці катлеты і пайшла да другіх сталоў, якія былі засланы белымі абрусамі і ўстаўлены сытнай стравай.

— Я,—кажа тав. Грынгауз,— адпачываю тут пяты раз і ніколі не папраўлялася так, як у гэтым годзе. За два тыдні я прыбыла ў вазе на 4 кілограмы.

— Тут, — дабавіла маладая дзяўчына Ганка Іванова,—шмат клапот праяўляюць аб людзях. Асаблівую ўвагу ўдзяляе нам памочнік дырэктара тав. Львовіч і тав. Нахамава.

Пасля сытнага абеду—мёртвы час.

Мы зайшлі ў чыста прыбраныя пакоі белых і зялёных домікаў, абстаўленых беласнежнымі ложкамі і кветкамі.

— Бачыце, як прыгожа і культурна мы тут жывем—развёўшы рукамі, паказала маладая жанчына—свінарка з соўгаса „Горкі Абчак" Ядзя Яноўская.

„Чаму-ж мне не пець,
Чаму-ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець"—

спявала ў другім пакоі пад гітару прыгожым альтам настаўніца Раіса Маньская.

— Рая, спаць! Досыць табе!

І стала ўсюды ціха. І ў пакоях, і на лужайцы, і на ўсёй вялікай тэрыторыі дома адпачынку.

А там глядзі і званок. Уставай і на падвячорак—гарбата, або кава з малаком і здобнымі булачкамі.

А пасля гэтага, о, пасля гэтага пачалася самая лепшая частка дня! Сонца пякло ўжо не так горача і фізкультурныя пляцоўкі хутка запаўняліся народам. Тут і валейбол, і гарадкі, і кракет, і тэніс, і більярд пад навесам. А калі сцямнела, пачалася мастацкая самадзейнасць—танцы, спевы і т. д.

Прыгожая ліпеньская ноч паступова клала свой змрок разам з невялікім туманам. Дзесьці недалёка заграў гармонік і некалькі жаночых галасоў заняглулі марш з „Вясёлых рэбят". Гэта група дзяўчат і хлапцоў ішлі з вечара самадзейнасці. Уперадзе ўсіх маладая работніца Аня Іванова. Белая майка і чорныя кудзеркі, якія ганяў вецер па яе прыгожым твары, надавалі ёй прыемны вясёлы выгляд.

Такімі бадзёрымі і жыццерадаснымі выглядаюць усе 650 адпачываючых, якія з'ехаліся з розных гарадоў ордэнаноснай Беларусі. Тут стаханаўкі і стаханаўцы прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі, настаўнікі, тэхнікі, служачыя і інжынеры—грамадзяне Совецкага Саюза.

Усім ім дадзена права на працу, права на асвету і права на адпачынак. Усім ім сталінская Канстытуцыя забяспечвае яшчэ больш заможнае і шчаслівае жыццё. І таму яны так удзячны вялікаму Сталіну за светлае сучаснае і яшчэ больш яркую будучыню.

Лагунова.

Ждановічы.

Абгаварэнне сталінскай Канстытуцыі у калгасе „Комсамолец Гомельшчыны". (Белсаюзфота)

ЛЁН У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

Раніцою, ледзь сонца паказваецца на небе, прыходзяць яны на свой участак. Іх рознаколерныя адзенні можна бачыць на полі і позна ўвечары. Гэта працуе стаханаўскае звяно калгаса „Усход“ Рыжкоўскага сельсавета.

Яшчэ з восені арганізавалася гэта звяно.

Горача адгукнуліся лепшыя калгасніцы на заклік таварыша Сталіна аб павышэнні ўраджайнасці, аб укараненні стаханаўскіх метадаў работы ў сельскую гаспадарку. Арганізатарам звяна з'явілася маладая жанчына, якая на першы погляд нічым не адрознівалася ад другіх.

Трымае сябе Марыя вельмі проста і скромна. Добрадушная ўхмылка не пакідае яе энергічнага твару. Але калі гутарка заходзіць пра лён, вокамгненна яе твар змяняецца: у вачах загараюцца іскры, у голасе з'яўляецца ўпэўненасць, якая не дапускае супярэчнасцей.

— Узялі абавязак даць звыш 6 цэнтнераў з гектара, а дамо звыш 8. І здамо лён першымі ў раёне і будзе ён не ніжэй 18—20 нумара. Пяршынства возьме наша звяно, — горда заяўляе т. Падгорная.

Але пра работу сваю Марыя расказвае вельмі скупа.

— У мінулым годзе калгас мяне вылучыў адказнай за лён. Здалі мы лён першымі ў раёне па 4,5 цэнтнера з гектара, 14-16 нумарам. Удзельнічала я на нарадзе перадавікоў-ільнаводаў. Там тав. Картукоў падводзіў вынікі ўборачнай кампаніі. У ліку перадавых назваў ён і наш калгас і мяне. Вельмі прыемна мне было слухаць, што кіраўнікі ЦК КП(б)Б адзначаюць нашу скромную работу. Захацелася мне сказаць, што мы будзем працаваць яшчэ лепш, будзем змагацца за яшчэ больш высокую якасць ільна. Вось я і выступіла на нарадзе. Перад выступленнем параілася з тав. Дзямянавым, старшынёй калгаса, і парашылі мы, што нашаму калгасу патрэбна ў 1936 годзе даць лепшыя паказальнікі апрацоўкі ільну. І я ўзялася працаваць па-стаханаўску, каб даць з гектара звыш 6 цэнтнераў.

За Марыяй Падгорнай пашла яе лепшая падруга Антаніна Сцепанава, тая самая, з якой Падгорная дзяліла радасць і гора бядняцкага дакалгаснага жыцця. Разам узяліся яны за арганізацыю стаханаўскага звяна ў калгасе. І праз некалькі дзён у іх было ўжо звяно з сямі лепшых калгасніц.

Саракагадовая Фёкла Сцепанава, удава, у мінулым бяднячка, з радасцю пайшла ў гэта звяно. Перажытыя дні, поўныя гора і нястач, густой сеткай раскідалі маршчынкі па яе твару. Многа гора прышлося перацярпець ёй раней, і таму з такой радасцю стала яна стаханаўкай-ільнаводкай.

Ёсць у звяне і маладыя. У кожнай сям'я, малыя дзеці, свае клопаты, але цесна звязвае ўсіх адна мэта: даць дзяржаве высокаякасны лён, паказаць, што і ў Беларусі лён можа расці выдатна.

Усе іх размовы пачынаюцца ільном і заканчываюцца ільном.

— Буду абавязкова вучыцца,— кажа дваццацігадовая Арына Маначкова,—але пасля таго, як здадзім свой лён 18—20 нумарам.

— Буду адпачываць пасля таго, як выканаем свае стаханаўскія абавязкі,—дадае Малання Сцепанава.

І так кожная з іх. Усе жыццёвыя планы іх—вакол ільну, з пашанай і любоўю гавораць яны пра лён, таму, што лён—іх дзецішча, выхаванае імі, выхаванае любоўна, калектыўна.

Марознай зімой пачало звяно вазіць угнаенне на свой участак. І навазілі столькі, што хапіла не толькі на іх участак, але і на ўсе 24 гектары калгаснага пасева лёну.

Пасеялі своечасова. Сабралі карэнні. Уважліва сачылі за ростам кожнага зерня. Падкармлівалі, два разы палолі. Хварэлі душой, калі бачылі, што жара затрымлівае рост ільну.

— Паліваць,—мільганула думка ў Падгорнай.

І не доўга думала звяно: прыладзілі пажарную машыну, якую

Удзельніца ўсебеларускай нарады жон спецыялістаў сельскай гаспадаркі, узнагароджаная граматай ЦВК БССР тав. БЕРГОВІНА А. А. арганізавала брыгаду жонак ІТР па ўборцы сена і зернавых культур.
На здымку: брыгада жонак на ўборцы. (Конезавод № 59). (Белсаюзфота).

Падгорная пазычыла ў суседнім калгасе, на плячах насілі брандспойты і палівалі свой лён.

Як радасна стала ім, калі ўбачылі, што лён пачаў падымацца! Лён хутка рос. 80 сантыметраў, 90 сантыметраў, 100. І гэта вельмі радавала стаханавак: яны своечасова нагатавалі звыш 4000 падпорак, каб падперці высокі лён.

Лён вырас небывалага памеру. Не памятаюць старыя калгасніцы, каб калі-небудзь быў такі лён. І гэта прыносіла звяну вялікую радасць.

Надвор'е сухое. Сонца паліць. Усё звяно напагатове, каб у любы момант дружна выйсці ў поле і распачаць цярабленне. Пры васковай спеласці пачалі цярабленне. Без мітусні, без шуму пачалі стаханаўкі ўборку лёну. Выцерабілі, звязалі ў снапы, звезлі на ток. Канвеерам ішла работа, ніякіх затрымак.

— Часу ў нас мала, лёну ўсё-ж 24 гектары, ноччу будзем абмалачваць, але ў тэрмін укладземся,—цвёрда кажа Падгорная.

Звяно т. ПАДГОРНАЙ.

Яе дружна падтрымлівае ўсё звяно.

— Да свята Кастрычніцкай рэволюцыі мы свой лён абавязкова здамо.

З вялікім энтузіязмам выконваюць калгасніцы свае абяцанні. Яны добра памятаюць прамову правадыра народаў таварыша Сталіна аб высокай ураджайнасці.

— Усе-ж законы для нас, працоўных. І Канстытуцыя, і закон аб забароне абортаў,—усё гэта для нас. Мы павінны шчырай работай адказаць на клопаты аб нас партыі і вялікага Сталіна,—заяўляе звяно Падгорнай.

Г. Пятроўская.

Шклоўскі раён.

ПА ТЫСЯЧЫ З ГЕКТАРА

Раней за ўсіх у калгасе „Чырвоны Кастрычнік" адсеяла лён звяно Куліны **Галубоўскай**. Пролетарскае свята—Першае мая яны сустрэлі з вялікай перамогай—поўнасцю засеялі 7,5 гектараў ільну. Папярэднікі падабралі добрыя: 3 гектары пасеялі на раскарчоўках, 3 гектары па канюшынішчу і 1,5 гектара па цаліне. Усходы былі дружныя, добрыя. Увесь лён падкармілі памётам і попелам. На канюшынішчы калгасніцы сабралі ўсё дзярноўе і карэнні.

— Не сабярэш карэнне, вырасце пырнік і заглушыць увесь лён,—гаварыла клапатлівая звеннявая сваім калгасніцам.

На ўчастку, дзе праводзілі раскарчоўку, лён пачаў як-бы вянуць. Галубоўская зараз-жа пасыпала яго чарназёмам. А праз пару дзён прайшоў дождж, і лён хутка дасягнуў метровай вышыні. Такі лён вырас і на канюшынішчы.

Лён пачаў падрастаць. Першачарговай задачай калгасніц было вызваленне палёў ад пустазелля. І таму палолі яны свае ўчасткі па тры разы.

На ўчастку плошчаю ў 0,49 гектара паявілася ільняная блошка. Куліна са сваім звяном зараз-жа ўвесь участак перасыпала, паліла вадою, і блошкі загінулі.

— Куліна—наш аграном,—кажуць старэйшыя калгасніцы. — Яна добра ведае ўсе агратэхнічныя правілы ўходу за ільном.

На працягу доўгага часу стаяла сухое, сонечнае надвор'е. Лён хутка набіраў васковую спеласць. Гэта добра і своечасова ўлічыла тысячніца Куліна.

— Цярабленне ільну пачынай толькі на паспеўшых участках, дзе лён набраў раннюю жоўтую спеласць, і ў строга выбарачным парадку—папярэдзіла вопытная адказная па ільну, тав. **Трапашкіна.**

7 ліпеня, ледзь пачало віднець, вышла на цярабленне ільну звеннявая Куліна. Хутка прышлі і астатнія чатыры калгасніцы. Дружна працавалі, работа спорылася ў іхніх руках. Непрыкметна хадзілі рукі і церабілі лён. Цярабленне праводзілі двайное: спачатку вырывалі даўжэйшыя сцяблы, а потым карацейшыя. Звязвалі лён маленькімі снапкамі па даўжыні і колеру, таму што ёсць лён, які пры здачы траціць пойдзе трэцім нумарам, а ёсць нумар два і паўтара.

—Дрэннага ільну ў мяне зусім няма,—гаворыць Галубоўская.

— Мы-ж спаборнічаем са звяном Дуні Прудніковай,—заўважыла адна калгасніца.

— Так, спаборнічаем. Звяно Дуні цярабленне ільну яшчэ не пачынала, але нас гэта ўспакайваць ні на хвіліну не павінна,—растлумачыла Куліна.

Яшчэ больш упарта працягвалі работу калгасніцы. Не заўважылі, як надышоў поўдзень. Маленькі перапынак на абед—і зноў за работу.

Сонца ўжо хавалася за лес. Брыгадзір Раманоўскі абмерыў выцераблены ўчастак. Кожная з калгасніц выцерабіла па 20 сотых гектара ільну, установленую норму цярабленя кожная перавыканала ў два разы. Гэта вестка абрадавала ўсіх калгасніц.

Хутка звяно выцерабіла ўсе 7,5 гектараў ільну. Услед за цярабленнем пачалі абмалот і расціл ільну.

—Я зараз упэўнена, што кожны гектар ільну дасць тысячу кілограмаў валакна,—заявіла Куліна.

За добрую работу праўленне калгаса прэміравала сваю лепшую звеннявую тав. Галубоўскую.

Міхась Шуранкоў.

Лёзненскі раён.

Першы квіток

Толькі праменні сонца асвяцілі шырокія калгасныя прасторы, як Аўгуст Аўчат і Карл Лейбург запраглі коней і выехалі на поле. На вялікім роўным загоне застракаталі жняркі. Услед за жняркамі ішлі калгасніцы, вязалі снапы і складвалі іх у бабкі.

Здалёк віднеліся калгасныя жнеі. Ёмка рэзалі вострыя сярпы сцяблы жыта. Жвавыя рукі хутка скручвалі вязьмо, вязалі снапы. Поле ўсё больш і больш усцілалася снапамі.

Калгасніцы без лішніх размоў рабілі сваю справу. Лепш за ўсіх працавалі Гануля Захарэнка, Караліна Альхоўка, Ульяна Чухнова і Усцінья Яцунская. Замест устачоўленай нормы ў 14 сотых яны зжналі па 26 сотых гектара жыта.

Непарыўна са жнівом пачалі звозку снапоў з поля. Калгаснікі цвёрда вырашылі ў гэтым годзе не дапускаць страты зярна. Да жняркак прыстасавалі зернаўлавіцелі. На поле, ачышчанае ад снапоў, адразу-ж пускаліся конныя граблі для падграбання калоссяў.

З першых дзён уборкі ў калгасе пачалі малацьбу і здачу чыстага і сухога збожжа дзяржаве. Здаўшы 458 кілограм добраякаснага жыта, калгас „Перадавік" атрымаў першы ў раёне квіток. Зараз калгаснікі і калгасніцы змагаюцца, каб першымі ў раёне поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па збожжапастаўках.

Міхасеў.

Лёзненскі раён.

ПЕРАМОГІ ТЫСЯЧНІЦ

Шырокім масівам раскінуліся палі калгаса імя Леніна. Куды не кінеш вокам, шырокай сцяной стаіць даспяваючая калгасная пшаніца, ячмень, лён. Ураджай у гэтым годзе чакаецца багаты, асабліва па лёну. Змагаліся калгаснікі, каб атрымаць не менш 30 цэнтнераў зернавых і не менш 10 цэнтнераў ільна, і гэта ў іх будзе.

Яшчэ нядаўна гэты масіў уяўляў сабой аднаасобныя палоскі. Сёння—гэта зямля калгаса.

Многа новых будынкаў пастаўлена на месцы старых халупак. Тут і новы кароўнік на 200 галоў, і цялятнік на 100, канюшня, зернасушылка, лазня, гумно, шмат жылых дамоў для калгаснікаў. З кожным годам умацоўваецца калгас, з кожным годам усё больш заможным і культурным становіцца жыццё калгаснікаў.

Ужо зараз калгаснікі калгаса імя Леніна атрымалі авансам па 1 руб. 50 кап. на працадзень, а ў мінулым і пасля разліку ў канцы года яны атрымоўвалі на працадзень па 88 кап.

Зараз калгаснікі купляюць адзенне, крэслы, нікеляваныя ложкі.

Наста Кашо, лепшая стаханаўка калгаса, з гордай ухмылкай кажа:

— У ліпені за атрыманы аванс мы ўжо купілі мужу і сыну па паліто, мне туфлі, 6 крэслаў, пра-

Стаханаўскае звяно жней калгаса „Чырвоная Ніва" Шклоўскага раёна.

водзім радыё. Ніколі я з сям'ёй не марыла так жыць, як жыву ў калгасе!

— Шкада, што няма ў мяне зараз дачушкі і што не магу я больш ражаць, а так-бы і тут я была стаханаўкай. Вялікую радасць выклікаў у мяне закон аб забароне абортаў, але для мяне ён ужо спазніўся,—з сумам дадае Наста.

Толькі цяпер Наста ўбачыла сапраўднае, заможнае жыццё. У калгас яна ўступіла адна з першых. Добрасумленна працуе ўвесь час.

— Зараз у мяне новая хата з 7 вокнамі, у калгасе набыла карову,—з вясёлай ухмылкай заяўляе Наста.

Наста—намеснік старшыні калгаса і адказная за лён, звенневая стаханаўскага звяна. Вельмі паважаюць у калгасе Насту, велічаюць яе не інакш, як Наста Елісееўна.

— Ніколі вёска Рыжкова не сеяла лён, нават нічога не чула пра лён. Не ўмелі сеяць, не ўмелі даглядаць яго,—расказвае Наста Елісееўна.—А ў 1934 годзе паспрабавалі пасеяць. Увесь лён загінуў і насенне не сабралі. Давай, думаю, вазьмуся я! Усю сваю маладосць працавала-ж я ў кулакоў.

У 1935 годзе вызначылі яе адказнай за лён. Узялася яна паказваць, як трэба сеяць, даглядаць. Лён вырас на славу. Ураджай у 1935 годзе знялі па 4,5 цэнтнера і здалі 16—18 нумарам.

У гэтым годзе стаханаўскае звяно Насты Елісееўны ўзяло на сябе абавязак здаць 10 цэнтнераў ільнавалакна з гектара. З самага пачатку звяно любоўна даглядала лён. Лён вырас у 1 метр і 10 сантыметраў. Небывалы рост!

Хутка звяно заканчвае цярабленне, а там—абмалот, трапанне і здача не менш, як 20 нумарам.

Калі сонца хавалася за лес, на небасхіле паказалася маленечкае воблачка.

— Напэўна ноччу будзе дождж!—устрывожана сказала Наста.—Трэба абавязкова звезці звязаны лён.

Хутка пабегла яна да старшыні калгаса, хутка снарадзіла 8 калгасных падвод, каб сабраць з поля высахшы ўжо лён. І калі на зямлю спусціўся вечар, лён быў ужо звезен. Наста са сваім звяном задаволеная спяшалася дадому, каб заўтра са свежымі сіламі зноў прыняцца за работу.

Стасіна.

Шклоўскі раён.

НАМ ПІШУЦЬ

Радасна сустракаем новую пазыку

Пастанову ўраду аб выпуску новай пазыкі другой пяцігодкі (выпуск 4-га году) рабочы калектыў нашага завода сустрэў з вялікім уздымам.

У хромавым цэху я першая падпісалася на поўны свой месячны заробак. За мной хутка выраслa вялікая чарга рабочых і работніц, якія таксама з вялікай ахвотай падпісаліся на пазыку.

Не магу знайсці слоў для таго, каб сказаць аб сапраўдным шчаслівым жыцці працоўных нашай квітнеючай радзімы!

Закон аб забароне абортаў і матэрыяльнай дапамозе шматсямейным—гэта ўсё вынікі сталінскіх клопатаў аб людзях.

Нідзе, ні ў адной капіталістычнай краіне няма такіх клопатаў аб людзях, якія адлюстраваны ў новай сталінскай Канстытуцыі.

Гэтым мы абавязаны нашаму вялікаму Сталіну. І таму я з такой вялікай радасцю пазычаю сваёй краіне свой месячны заробак. І я проста заяўляю, што калі патрэбна будзе, аддам і жыццё за сваю слаўную радзіму.

Хвашчэўская.

Менск,
завод «Большэвік».

У барацьбе за 10 цэнтнераў

Барацьбу за высокі ўраджай лёну я са сваім звяном распачала ранняй вясной. Пасеялі чыстагатунковым насеннем, штодзённа даглядалі пасевы. І наш лён вырас у 1 метр і 10 сантыметраў. Мы спадзяемся, што атрымаем не менш 10 цэнтнераў з гектара. Такую мэту перад сабой мы ставілі з самага пачатку і гэтага даб'емся.

Цярабленне мы пачалі пры васковай спеласці.

Добра працуюць па цярабленню Анна Гарбаценка, Ліза Кандраценка, Прося Руспянова і іншыя. Усе яны выконваюць нормы цярабленя на 100—150 процантаў. Цярабленне праводзім двайное, адразу прасушваем лён, вяжам у снапы і возім у ток.

У канцы жніўня пачнем здаваць лён. Спадзяемся, што здачу закончым першымі ў раёне.

Ульяна Маханенка.

Калгас «Новае жыццё»,
Чаускага раёна.

Супраціўленне новаму метаду

Калгас «Свой труд» Еўлахаўскага сельсовета машын не мае і дагавору з МТС на ўборку не заключыў. Свае 145 гектараў збожжавых культур калгас па плану павінен быў убраць за 25 дзён. Справа ў тым, што пры ручным жніве жанчынам прыходзіцца жаць і вязаць снапы, а потым іх адносіць і станавіць у бабкі. Такім чынам, яны больш заняты на дапаможнай рабоце, чым на самом жніве. Ясна, што гэта вельмі зацягвае ўборку.

Але калгаснікі добра ведаюць лозунг любімага Сталіна аб тым, што кадры, аўладаўшыя тэхнікай, рашаюць усё. І таму яны парашылі скончыць уборку датэрмінова.

15 ліпеня 37 жанчын калгаса «Свой труд» распачалі жніво. Ад усіх адрознівалася звяно Марфы АЎЧЫНКІ, якая работу арганізавала па новаму, па стаханаўску. Удзельнікі звяна толькі жалі, а спецыяльна вылучаная жанчына хадзіла ўслед за імі, вязала і адносіла снапы.

Працуючы такім спосабам, звяно за 3 гадзіны выканала дзённую норму: зжала па 10 сотак га густога жыта на кожнага чалавека, у той час, як большасць жанчын, працуючы па старынцы, за 4 гадзіны зжалі па 4 сотых га.

Трэба адзначыць, што звяно мела-б больш поспехаў, калі-б у рабоце яму дапамаглі кіраўнікі калгаса. АЛЕ СТАРШЫНЯ КАЛГАСА СЯМЁН НАРЧУК ГЭТАМУ ЗВЯНУ ВЫЛУЧЫЎ ГОРШЫ ЎЧАСТАК, А ПРЫ АБМЕРУ ПЛОШЧЫ ІМКНУЎСЯ ЗМЯНШАЦЬ ВЫПРАЦОЎКУ СТАХАНАЎСКАГА ЗВЯНА І ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВЫПРАЦОЎКУ ДРУГІХ ЗВЕННЯЎ.

А. Зусін.

Талачынскі раён.

Анюта Латушка

Адна за другой збіраюцца дзяўчаты на калгасны двор, каб усім разам пайсці на поле. Следам за імі, занёсшы дзяцей у яслі, ідуць і жанчыны. З комінаў даўно ўжо не ідзе дым. Усе смачна паснедалі белымі блінамі з салам і смятанай, і спяшаюцца на работу.

Яшчэ няма 7 гадзін раніцы, а на полі ўжо жнуць. Да 20 ліпеня брыгада Анюты ЛАТУШКА зжала 48 га жыта з 91 гектара і 6 га ячменю з 16 гектараў. У першыя дні жалі выбарачным парадкам, там дзе жыта і ячмень хутчэй выспелі. Усё збожжа брыгада з дапамогай снопавязалкі і двух жняярак зжала да 23 ліпеня. Адразу-ж пачалі малаціць на загадзя падрыхтаваным таку. На жніве не засталося калоссяў. Іх начыста падабралі жнеі.

Ударна працавалі калгасніцы Марыля ХМЕЛЬНІЦКАЯ, Даша ЛАТУШКА, Ганна АБМЕТКА і Феня ЛОЗНЯК, якія замест нормы 10 сотак, выжыналі штодзённа 28—30 сотак гектара жыта, пры добрай якасці работы.

Не адставалі ад іх даяркі, даглядчыцы і цялятніцы. Васілена ЛАТУШКА, МІХАЛЁВА і ЛІПНІЦКАЯ, закончыўшы работу на ферме, перавыконвалі нормы на жніве.

**
*

Брыгадзір-комсамолка Анюта Латушка не толькі член праўлення калгаса. Яна член рэдкалегіі насценнай газеты і праводзіць чытку газет у брыгадзе. Тры гады працуе Анюта грамадскім санітарным інспектарам у калгасе. Па яе прапанове адрамантавалі і пачысцілі ўсе калодзежы. На вуліцах няма смецця і бруду. Перад некаторымі хатамі пачынаюць з'яўляцца градкі з кветкамі. Усюды адчуваецца пільны догляд Анюты.

За ўдарную работу штогод атрымоўвае Анюта прэміі грашыма і мануфактурай. Яна выпісвае і ўважліва чытае газеты і журналы і марыць аб тым, каб паехаць вучыцца і стаць спецыялістам сельскай гаспадаркі. Няма ніякага сумнення, што мары яе збудуцца.

Спорыцца работа ў брыгадзе Латушкі. Весела ідзе час.

М. ЖУК.

Калгас «Пролетарскі ўдарнік» Смалявіцкага раёна.

Шчаслівае мацярынства

Шчыра дзякую нашай партыі і асабіста тав. Сталіну за вялікую ўвагу да нас—жанчын.

Я нядаўна стала шчаслівай маткай. Радзіла я ў радзільні Гацухаўскага сельсовета, Уздзенскага раёна.

Хата-радзільня—гэта чыстае, светлае памяшканне. Цяплынёй і клопатамі атулены там рожаніцы.

Акушэрка тав. Дубоўская пяшчотная і ласкавая, як маці. Яна не толькі шчыра выконвае свае абавязкі, яна вядзе і вялікую грамадскую работу, чытае кніжкі з рожаніцамі, вядзе гутаркі, як трэба даглядаць і карміць дзяцей.

У хату-радзільню жанчыны едуць здалёк, вось і я прыехала сюды за 20 кілометраў.

Зараз я ляжу ў светлым пакоі на чыстым ложку і ўспамінаю расказы маёй маткі аб тым, у якіх жудасных умовах яна раджала. У полі, у час работы, у свіным хляве. Але гэта — далёкае мінулае, праклятае мінулае.

Цяпер мацярынства ў нас светлае, шчаслівае. Няхай-жа наш любы Сталін жыве многа, многа год!

Т. Кукарэвіч.

Калгасніца калгаса «Звязда», Уздзенскага раёна.



Ранішняя зарадка ў дзіцячым садзе Менскага завода „Большэвік". (Фото Раскіна)

СВЕТЛАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Быў летні жаркі дзень. Па роўнай, усыпанай жоўтым пясочкам дарожцы чарнявенькая Соня Гутман каціла калясо. Раптам яна ўбачыла пярэстую птушку, якая сядзела на галінцы. Пазабыўшы пра калясо, Соня кінулася бегчы да дзяцей, гуляўшых ля вялікай клумбы кветак.

— Рэбята! — радасна ўсклікнула Соня. — Хутчэй сюды. Зязюля!

Першай прыбегла дзесяцігадовая Женя Геніна. Глянуўшы на птушку, Женя напяла ніжнюю пунцовую губу і расчаравана праказала:

— Гэта зусім не зязюля, а птушка!

— А вось зязюля! — настойвала Соня.

— А вось птушка! — сцвярджала Жэня.

— Чэснае піонерскае, — зязюля, — не ўступала Соня. — Не верыш, запытайся ў настаўніцы!

Аднак, пакуль настаўніца падышла, сядзеўшая на галінцы птушка узмятнула крыллямі і схавалася ў гушчы зялёных лістоў.

* * *

Мірна і ясна цякуць дні на дзіцячай пляцоўцы 13 і 31 школ. Весела і цікава праводзяць рэбята час, цёплыя і нежныя іх сяброўства і спаянасць. У вялікім садзе яны адпачываюць і загараюць, гуляюць і весяляцца, далучаючыся да вялікіх большэвіцкіх традыцый — любові да калектыва і прагнасці ведаў.

Пляцоўка гэта працуе з 15 чэрвеня. Хаця яна і была арганізавана яшчэ 5 чэрвеня, аднак не магла пачаць сваю работу з-за... адсутнасці падыходзячага месца.

Над 13 і 31 школамі шэфствуе калектыў швейнай ф-кі „Сцяг Індустрыялізацыі", якая мае ў цэнтры горада цудоўны сад. Здавалася-б, чаго прасцей — прадаставіць сад для дзіцячай пляцоўкі сваіх-жа падшэфных школ?

Але не тут то было.

Фабком швейнай фабрыкі ні за што не хацеў дапускаць, каб пляцоўка знаходзілася ў садзе. І толькі пасля энергічнага ўмяшання горсовета дзіцячая пляцоўка была нарэшце дапушчана ў сад.

Зараз тут каля 50 рэбят ва ўзросце ад 7 да 12 год.

Раніцой дзеці збіраюцца ў 13 школе. Яны робяць фізічную зарадку і ідуць у сталовую снедаць. Пасля снедання дзеці накіроўваюцца ў сад.

Тут у цені раскідзістых дрэў сярод зялёных газонаў і клумб дзеці праводзяць увесь свой дзень.

Кіруе пляцоўкаю настаўніца 3-га класа тав. Кароткіна. Яна праводзіць з дзецьмі масавыя гульні, чыткі і гутаркі на бягучыя тэмы.

А калі газеты прынеслі сумную вестку аб смерці вялікага пролетарскага пісьменніка Максіма Горкага, тав. Кароткіна расказала рэбятам аб яго жыцці і творчасці. Затым самі дзеці прачыталі ўрывак, дзе Алексей Максімавіч апісвае сваё дзяцінства. І трэба было бачыць, якія ў рэбят былі сумныя твары, як шкадавалі яны разумнага, чулага хлопчыка Алёшу, якому давялося столькі пакутваць ад жорсткіх гаспадароў.

Так, сумнае, безрадаснае дзяцінства было ў вялікага пролетарскага пісьменніка. А якое светлае і радаснае дзяцінства маюць нашы совецкія рэбята. Яно заваёвана совецкім народам, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Гэта заўсёды гаварыў і пісаў Максім Горкі ўсім рэбятам, якія прыходзілі да яго, якія пісалі яму.

Віцебск. **Р. Вельтман.**

Сёння сотні сярэдніх, дзесяткі вышэйшых Навучальных, даследчых у нас установ.

Маладосці на свеце няма шчаслівейшай, Як у нашых шчаслівых дачок і сыноў.

(З пісьма беларускага народа вялікаму СТАЛІНУ).

Рэдакцыя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“ пачынае друкаваць серыю, апавяданняў доктара Гузарэвіча на тэму аб папярэджанні (прафілактыкі) розных захворванняў.

Напісаныя ў жывой, папулярнай форме гэтыя невялічкія апавяданні разлічаны на чытачоў—рэбят, на то, каб яны азнаёміліся з прасцейшымі мерамі папярэджання хвароб: дызентэрыі, скарлатыны, дыфтэрыту, столбняку і т. д.

Рэдакцыя звяртаецца да сваіх чытачак з просьбай наладзіць чыткі гэтых апавяданняў з дзецьмі, абмеркаванне іх, дасылаючы свае водгукі і заўвагі па адрасу рэдакцыі нашага журнала.

Мы спадзяемся, што азнаямленне рэбят з прафілактычнымі мерапрыемствамі праз такі лёгкадаступны матэрыял прынясе значную карысць.

АПАВЯДАННЕ
пра тое, як згінулі мухі

У весну ў кучы гною жылі-былі муха-тата і муха-мама. Захацелася ім дзетак. Старыя кудысьці разляцеліся, а без дзетак сумна жыць. Муха-мама і паклала ў гнойную кучу 100 яечак. Яечкі ляжаць сабе ў кучы, а муха-мама і муха-тата вартуюць іх.

Праходзіць тыдзень. Надыходзіць другі. У канцы другога тыдня з яечак выраслі маленькія мушкі. Вырасла 100 маленькіх мушак.

Раптам нечакана-негадана здарылася страшэнная бяда. Па двары праходзіла свінуша, пудоў на дзесяць туша. Вочкі ў яе тлушчам заплылі, нічога не бачыць. Ідзе па двары і хрукае: хру, хру! Не заўважыла яна мушак, наступіла нагою на кучу гною і расціснула іх.

Жывымі засталіся толькі муха-тата і муха-мама і дзесяць мушак—дачушак. Муха-тата, муха-мама і мушкі-дачушкі горка заплакалі, а ўвечары рашылі паляцець на леташнюю кватэру да хлопчыка Вані.

Ваня быў нядбайнік, неахайнік. Яго сястрыца Вера заўсёды смяялася:

— Гляньце, як есць Ваня! Ён цэлыя кавалкі глынае, ён падлогу засмечвае, ён супу не есць.

Прыляцелі мухі да дому Вані, уляцелі праз вакенца ў пакой і пасяліліся на печцы.

Жывуць сабе пажываюць, гора не знаюць. Прыдзе раніца. Выгляне сонейка. Прачнуцца мушкі і паляцяць па ўсяму гораду. Уперадзе ляцяць муха-тата і муха-мама, а за імі мушкі-дачушкі. Наядуцца ўсялякай дрэні, перамараюцца і ляцяць далей.

Па-дарозе яны заўсёды заляталі да Пеці.

Раз заляцелі мушкі да Пеці і адразу ў буфет. Паелі булачкі, павідлам закусілі, ускочылі на цукар, уздрапаліся на вакенца, схаваліся за фіранку і здаволеныя заспявалі:

— З-з-з-з-з! Пеця цяпер паесць гэтыя прадукты і захварэе. Запомніце, любыя дачушкі, гэтага хлапчука: хутка прыляцім піць яго кроў!

Паляцелі мушкі далей.

Ляцяць з адной вуліцы ў другую. Уляцелі ў пакой і бачаць: ляжыць у ложку Коля, худы-худы, і голасна стогне:

— О-о-о-ой,-ой,-ой!

Стогне Коля на ўвесь дом, а каля яго тата і мама слязмі заліваюцца: шкада ім Колю.

А муха-тата і муха-мама ўзрадаваліся і сказалі мушкам-дачушкам:

— Вось дзе мы смачна папалуднуем. Коля хворы ды-зен-тэ-ры-яй, а дызентэрыя гэта наша прыяцельніца. Яна корміць нас, а мы яе. Мы зараз папалуднуем крывёю Колі і паляцім у іншыя дамы. А ў іншых дамах заразім прадукты дызентэрыяй, дзеці з'ядуць гэтыя прадукты і таксама захварэюць.

Папалуднавалі мухі крывёю Колі і паляцелі далей.

Ляцяць, ляцяць мушкі па гораду, захацелася ім піць. Убачылі праз вакенца ў адным доме на стале гарлач з малаком. Уляцелі ў дом мушкі і накінуліся на малако. Выпілі нямнога, а малако сапсавалі.

Убегла ў дом дзяўчынка Галя, памыла з мылам рукі, падышла да малака і з дасадаю сказала:

— Зноў малако не накрыта! Ох, як не люблю брудніцу! Ну, як цяпер малако піць? Магчыма ў ім мухі пабывалі і заразу занеслі.

Пастаяла, падумала, але занадта ўжо яна любіла малачко, не вытрымала, наліла шклянку і выпіла.

А мушкі на ваконцы радуюцца, хіхікаюць:

— Хі-хі-хі-хі, захварэе цяпер Галя! Праз 14 дзён прыляцім піць яе кроў.

А таго дурныя мушкі і не ведалі, што Галя зрабіла сабе супроцьдызентэрыйную прышчэпку. А хто прышчэпку зрабіў, той не захварэе.

Аднойчы сапсавалася надвор'е і мухі засталіся дома.

Ваня ў той дзень прышоў са школы вельмі сумны. Сядзеў ён за сталом у часе абеду і нічога не еў. Тата і мама перапужаліся.

— Што з табою?

— Сёння ў школе ўрач нам пра мух расказваў,—адказаў Ваня.— Ён казаў, што пятая частка ўсіх хвароб выклікаецца мухамі, а ў нас шмат мух у доме. Вось яны сядзяць на хлебе, смятане, пірожках. Я баюся цяпер абедаць. Я баюся тыфу, дызентэрыі, паносаў.

Тата і мама пачалі заспакойваць Ванюшу.

— Гэта так, не змагаліся мы з мухамі, але пасля абеда разам возьмемся за іх.

Павесялеў Ваня. Пасля абеда пачалі мух ганяць. Вера—насавой хустачкай, Ваня—шчоткаю, мама—рушніком, а тата—прастыняй.

Успалашыліся мухі. Лётаюць па ўсяму дому і крычаць:

— Разбой, з-з-ж-ж!

Мітусіліся, мітусіліся па ўсяму дому, пакуль іх усіх не забілі.

Толькі муха-тата цераз трубу выратавалася. Ляціць па гораду муха-тата і горка плача, і да тэй пары лётала, пакуль не патрапіла ў рот сабаку Грознаму.

Пасля смерці мухі-таты, мухі-мамы і мушак-дачушак заплакалі тыфы, дызентэрыя, халера, і паносы. Заплакалі, загаласілі, і пакінулі назаўсёды гэты горад.

І з таго часу ў тым горадзе дзеці і дарослыя не хварэюць гэтымі хваробамі.

Доктар **Гузарэвіч.**

Цана 20 кап.

831

Да гэтага нумара дадаецца ўкладка-выкрайка.

(Белсаюзфота).

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Мінск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 861. Тыраж 10.443 Уп. Галоўлітбела № Ш—3277

Здана ў набор 25/VII—36 г. Падпісана да друку 7/VIII—36 г. У нумары 2¹/₇ арк. 120.140 друк. знакаў.